10. Золотова, Г.А. Коммуникативная грамматика русского языка / Г. А. Золотова, Н. К. Онипенко, М. Ю. Сидорова. – М.: Наука, 2004. – 544 с.
11. Караулов, Ю. Н. Русский язык и языковая личность / Ю. Н. Караулов. – М.: Наука, 1987. – 261 с.
12. Косарик, М. А. К проблеме традиции и инновации в истории языкознания. Ренессансная и современная лингвистические парадигмы. Связь эпох / М. А. Косарик // Вестник Моск. ун-та. Сер. Филология. – 1995. – № 5. – С. 104–116.
13. Кубрякова, Е. С. Эволюция лингвистических идей во второй половине XX века / Е. С. Кубрякова; под ред. Ю.С. Степанова. – М.: Наука, 1995. – С. 149 – 238.
14. Кун, Т. Структура научных революций / Т. Кун. – М.: Прогресс, 1977. – 300 с.
15. Ломов, А. М. Типология русского предложения / А. М. Ломов. – Воронеж: Изд-во Воронеж. гос. ун-та, 1994. – 280с.
16. Постовалова, В. И. Лингвокультурология в свете антропологической парадигмы (к проблеме оснований и границ со сменой фразеологии) / В. И. Постовалова // Фразеология в контексте культуры. – М.: Языки русской культуры, 1999. – С. 25–34.
17. Рамишвили, Г. В. Гумбольтианство / Г. В. Рамишвили // Языкознание. Большой энциклопедический словарь; гл. ред. В.Н. Ярцева. – 2-е изд. – М.: Большая Российская энциклопедия, 2002. – С. 123–124.
18. Ричардс, А. А. Философия риторики / А. А. Ричардс // Теория метафоры. – М.: Прогресс, 1990. – С. 44–67.
19. Рубинштейн, С. Л. Основы общей психологии / С. Л. Рубинштейн. – СПб.: Питер, 2000. – 712 с.
20. Степанов, Ю. С. В трёхмерном пространстве языка (семиотические проблемы лингвистики, философии, искусства) / Ю. С. Степанов. – М.: Наука, 1985. – 335 с.
21. Степанов, Ю.С. Методы и принципы современной лингвистики / Ю. С. Степанов. –М.: Наука, 1975.–313 с.
22. Хайдеггер, М. Время картины мира / М. Хайдеггер // Новая технократическая волна на Западе. – М.: Прогресс, 1986. – С. 93–119.
23. Фрумкина, Р. М. Психолингвистика: Учеб. пособие для студ. высш. учеб. заведений / Р. М. Фрумкина. – М.: Изд. центр «Академия», 2003. – 320 с.
24. Якобсон, Р. Лингвистика и поэтика / Р. Якобсон // Структурализм «за» и «против». – М.: Прогресс, 1975 . – С. 193–230.
25. Якобсон, Р. Два аспекта языка и два типа афатических нарушений / Р. Якобсон //Теория метафоры: СПб.; М.: Прогресс, 1990. – С. 110–132.
26. MacKay, D. M. In search of basis symbols / D. M. MacKay // “Cybernetics”, Transactions of Eighth Conference. – New York, 1952. – P. 182–188.
27. Martinet, A. Elements de Lingvistigue generale / A. Martinet // Новое в лингвистике. – М. – 1963. – Вып. III. – С. 468.

**S.V. Chebotareva**
Regional independent newspaper “Lipetsk news”
e-mail: jasenija@yandex.ru

**Man as the main value orientation of modern linguistics; anthropocentrism of the comparison category**

*Key words: Anthropocentrism, Anthropocentric paradigm, Comparison, Possible world, Mental.*

*The article is devoted to regularity of formation of a new anthropocentric linguistic and general scientific paradigm permitting and demanding studying of all linguistic categories from a position of anthropocentrism. The question of the person as the main measure of a linguistic system of the category of comparison is touched upon in the paper.*

**А.М. Чарнавокая**
Інстытут літаратуразнаўства імя Янкі Купалы
Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры
Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі
e-mail: lecsa87@gmail.com

УДК 821.161.3.09

## АДЛЮСТРАВАННЕ ПРАБЛЕМ СЕКСУАЛЬНАЙ РЭВАЛЮЦЫІ 1920-Х ГГ. У БЕЛАРУСКАЙ ПРОЗЕ

*Ключавыя словы: сексуальная рэвалюцыя, сацыяльныя праблемы, Якуб Колас, Кузьма Чорны, Платон Галавач.*

*Пасля рэвалюцыі 1917 г. пачалі рэзка змяняцца ўяўленні пра дазволенае і непажаданае, прымальнае і непрымальнае ў асабістым жыцці. Беларуская проза засведчыла сутыкненне «новых поглядаў» і традыцыйнай маралі, якое мела трагічныя наступствы для многіх маладых жанчын. У артыкуле аналізуюцца і супастаўляюцца творы, прысвечаныя гэтай тэме.*

Пазнавальная (інфарматыўная, гнасеалагічная, кагнітыўная) функцыя літаратуры заўсёды мела вялікае значэнне для чытачоў і даследчыкаў. Заснавальнік культурна-гістарычнай школы Іпаліт Тэн лічыў галоўнай вартасцю літаратуры яе выключны пазнавальны патэнцыял. Мастацкі твор паводле І. Тэна «пераўзыходзіць усе іншыя дакументы, якія выяўляюць пачуцці папярэдніх пакаленняў», гэта «цудоўны, надзвычай адчувальны прыбор для вывучэння жыцця нацыі» [1, 33].



Репозиторий ВГУ

Імкненне адлюстраваць і асэнсаваць сацыяльную рэчаіснасць мае асаблівую значнасць для пісьменнікаў-рэалістаў. Арыентацыя на творчыя прынцыпы рэалізму была адной з вядучых тэндэнцый у беларускай літаратуры 1920-х гадоў. Пісьменнікі надавалі вялікую ўвагу актуальным сацыяльным праблемам, сярод якіх востра стаяла праблема адмоўных наступстваў сексуальнай рэвалюцыі.

Гендарная сітуацыя дваццатых гадоў азначана нестабільнасцю, суіснаваннем розных жыццёвых установак, фарміраваннем новых мадэлей паводзін.Стасункі паміж мужчынам і жанчынай сталі больш свабодныя. Але абвешчаная свабода была выгоднай галоўным чынам для мужчын – многія жанчыны сталі ахвярамі сексуальнай рэвалюцыі, бо неслі адказнасць задзяцейбязбацькавічаў, атрымлівалі праблемы са здароўем у выніку нелегальных абортаў. Уражвае знаёмства з дакументамі жанаддзела ЦК КП(б)Б: беспрацоўе жанчын у буйных гарадах вызначала рост прастытуцыі, дэклараваная свабода міжасабовых дачыненняў стала прычынай з'яўлення шматлікіх «беспрытульных маці» [2, 77].

Гэтыя праблемы знайшлі яскравае адлюстраванне ў тагачаснай беларускай прозе. У літаратурна-мастацкіх выданнях рэгулярна друкаваліся апавяданні, прысвечаныя сумным наступствам сексуальнай рэвалюцыі. Натуральна, далёка не ўсе творы былі важным літаратурным фактам і траплялі ў поле зроку даследчыкаў. Найбольшая ўвага была прысвечана творам М. Зарэцкага, да якіх звярталіся А. Майсеенка, М. Мушынскі, І. Воюш, Т. Фіцнер, аповесці А. Мрыя «Запіскі Самсона Самасуя», прааналізаванай у манаграфіі А. Назарава «Тайнапіс Андрэя Мрыя». Адно з найноўшых даследаванняў –праца гісторыка А. Гужалоўскага «Сэксуальная рэвалюцыя ў Савецкай Беларусі: 1917 – 1929 гг.», дзе мастацкія творы, як і вытрымкі з дакументаў і газетных публікацый дазваляюць раскрыць спецыфіку складаных сацыяльных працэсаў.

Найчасцей выяўленне праблем, абумоўленых сексуальнай рэвалюцыяй, адбывалася праз апісанне драматычнага жаночага лёсу. Адным з першых твораў на гэту тэмубыло апавяданне Платона Галавача «Загубленае жыццё» (1925). Адметна, што ў гэтым творы ўвага звяртаецца і на праблему арганізацыі дзейснай дапамогі пацярпелым жанчынам. Пасля няўдалага аборту парабчанка Ніна прыходзіць у жанаддзел скардзіцца на паніча, які падмануў яе і прымусіў перарваць цяжарнасць. «Яшчэ адна ахвяра панскай прыхамаці. Бедная, слабая. Хто ж табе дапаможа, калі не мы, якім адчыніла вочы рэвалюцыя. Паможам табе сястрыца,» – думае жанарганізатар таварыш Паша [3, 50]. Паша плануе правесці паказальны суд над панічом, а Ніну накіраваць у смаленскую бальніцу. Аднак сардэчнасць і зычлівасць Пашы не пераважваюць агульнае асуджэнне грамады. Крыўда і сорам бяруць верх над верай у новую ўладу, дзяўчына скончвае жыццё самагубствам. Вінаватыя ў гэтым, на думку Пашы, аднавяскоўцы Ніны, якія замест падтрымкі выказалі асуджэнне. У апавяданні выяўляецца не толькі жаночая «цемната», але і адсутнасць даверу да грамадскіх установаў, якія гатовы вырашаць праблемы жанчын.

Вобраз Ніны, як і большасці іншых персанажаў, якіх можна аднесці да тыпу «падманутай дзяўчыны», створаны праз зварот да дынамічнага (знешняга) псіхалагізму, пры якім раскрыццё духоўнага вобліку герояў неаддзельна ад апісання іх дзеянняў і ўчынкаў, на першым месцы знаходзіцца паказ знешняга жыцця. Аўтары звяртаюцца да пашыранага ў літаратуры сюжэта спакушэння дзяўчыны, засяроджваюцца на ключавых падзеях, але не імкнуцца да паглыбленага псіхалагічнага аналізу, бо не рызыкуюць уявіць спецыфічны жаночы досвед.

Сярод нешматлікіх выключэнняў – апавяданне П. Галавача «Абмылілася» (1927), дзе аўтар надаваў вялікую ўвагу псіхалогіі гераіні, імкнуўся прааналізаваць, чаму яна робіць няправільны крок, разгледзець сацыяльна-гістарычную абумоўленасць учынкаў і паводзін.

Дачка строгага набожнага краўца, Ліда займаецца хатняй працай, не мае сяброў, адчувае сябе адмежаванай ад грамады. Янапрагне далучыцца да новага жыцця, пра якое шмат пішуць у кнігах і газетах, сама складае вершы пра рабочых. Як асоба недасведчаная і ўражлівая, Ліда ідэалізуе камуністаў: «Разуменне – камуністы яна правільна звязвала ў адно з разуменнем будучага жыцця і ад гэтага ўяўляла сабе камуністаў людзьмі зусім другімі, якія адрозніваюцца ад людзей наогул. "Яны – будаўнікі будучыні, а хіба вось гэткія людзі, што вакол мяне, могуць быць такімі будаўнікамі? Не! Яны павінны быць зусім другімі, без усіх заган, людзьмі чыстымі, якія цалкам аддаліся сваёй ідэі, як хацела б аддацца ёй я!" <…> З'явілася незадавальненне сабой; узбудзілася з большай сілай жаданне далучыцца да новага ў жыцці» [3, 119]. Ліда радуецца знаёмству з сапраўдным камуністам (а насамрэч, былым афіцэрам і сынам святара), які мог бы кіраваць яе развіццём, вучобай і такім чынам выцягнуць з нялюбага «мяшчанскага балота».

Аўтар імкнуўся падрабязна апісаць псіхічны стан гераіні: адзінота, заніжаная самаацэнка, няўпэўненасць, адчуванне непатрэбнасці, уласнай нязначнасці – сімптомы крызісу ідэнтычнасці, з якім сутыкнуліся многія сучасніцы пісьменніка. Праз стварэнне ўнутраных маналогаў П. Галавач паказаў, як даверлівая дзяўчына асэнсоўвае сацыяльныя змены, чамупаўстае ахвярай не толькі мужчынскага падману, але і «фабрыкі ілюзій», у якую паступова ператваралася савецкая культура.

Репозиторий ВГУ

Ліда знаёміцца са сваім героем на дыспуце, прысвечаным «новаму шлюбу». Развагі пра новае жыццё, новыя стасункі дапамагаюцьмужчынамсхіліць дзяўчыну да блізкіх адносін, што акцэнтуецца і ўрамане З. Бядулі «Язэп Крушынскі» (1928–1932). Галоўны герой (жанаты) змагаецца з нерашучасцю маладой настаўніцы Стэфкі праз апісанне гендарных змен: «Адно з найвялікшых дасягненняў савецкай улады – гэта вызваленне кабеты. Не вызваленне яе ад працы, бо яна цяпер працуе не менш мужчыны, займаецца часам такой працай, якой раней толькі мужчына займаўся, – але тут ёсць большае: вызваленне духу кабеты. Яна цяпер вольная рабіць такія ўчынкі, пры якіх раней называлі б яе брыдкімі імёнамі. Цяпер муж ані пікні! Захацела жонка – і кідае мужа, і жыве, як хоча і з кім хоча. Цяпер дзяўчыне не жыццё а рай» [4, 315].

Да выяўлення драматычных акалічнасцей сексуальнай рэвалюцыі звяртаўся і Якуб Коласу апавяданні «У двары пана Тарбецкага» і аповесці «На прасторах жыцця», напісаных у 1926 годзе. Дарэчы, менавіта ў гэтым годзе быў прыняты другі савецкі кодэкс законаў аб шлюбе, сям'і і апецы, паводле якога рэгістрацыя шлюбаў стала неабавязковай, бо кодэкс прызнаваў легітымнымі існуючыя фактычныя шлюбы.

Нарыс «У двары пана Тарбецкага» адлюстроўвае побыт, звычкі, стасункі жыхароў гарадскога дома, сярод якіх багата жанчын. Аўтар, нібы са слоў суседзяў, характарызуе іх у першую чаргу паводле сямейнага становішча: швачка Алена Мастоўская – «муж яе невядома дзе, а яна тут адна і за кватэру ўжо тры месяцы не плаціла»[5, 74];«прачка Варакса і яе напалавіну замужняя дачка Анэта» [5, 76];Марыся Шпала – «нідзе не служыць, заработкаў не мае, а нейк жыве сама і дзяцей гадуе. На якія сродкі жыве, квартаранты пана Тарбецкага не ведаюць. А калі хто ведае, то маўчыць» [5, 98].

Між насельнікамі двара пана Тарбецкага няма добразычлівасці і паразумення. Галоўным зместам жаночай сваркі –самай яркай падзеі твора – робяцца кпіны з асабістага жыцця. Здрада мужа, дзіцёбязбацькавіч, аборт – усе гэтыя акалічнасці, прымальныя з пункту гледжання ліберальнай палітыкі, балюча перажываюцца жанчынамі, якім патрэбна большая пэўнасць і ўладкаванасць. За намёк на аборт (ці кінутае дзіця) жанчына гатова забіць сваю суседку. На двары пана Тарбецкага ёсць і поўныя сем'і, але праз праблемную скіраванасць нарыса пісьменнік і тут не выяўляе гарманічных адносін.

У аповесці «На прасторах жыцця» галоўная гераіня Алёнка, верная сваёй першай сімпатыі, супрацьпастаўляецца студэнтцы Ніне. Паверыўшы сакратару фабкама Шулевічу, Ніна вызваляецца ад «мяшчанства» і «буржуазнай этыкі», але пасля блізкіх стасункаў вымушана рабіць аборт. Дзяўчына ведае, што «страхі і стыд – адгалоскі даўнейшых поглядаў на жанчыну, калі яна была зняволена і цалкам аддана пад уладу мужчыны» [5, 93], што сучасная жанчына даўно «перастала лічыцца з старымі поглядамі на цнатлівасць» [5, 93]. Тым не менш, Ніначяжка перажывае падман, адчувае сябе зняважанай і робіць выснову, што з мужчынамі трэба быць больш абачлівай і асцярожнай. Аўтар лаканічна акрэслівае псіхалагічны стан гераіні, выяўляе яе думкі праз дыялогі і няўласна-простую мову.

Я. Колас дэманструе, штонормы традыцыйнай культуры застаюцца значнымі для многіх маладых жанчын. Нават у савецкі час паважлівае стаўленне магчымае толькі да замужняй кабеты, а іншыя варыянты разглядаюцца як дэвіяцыі.

У апавяданнях Кузьмы Чорнага «Пробуюць грушы шумець» (1926), «Сцены» (1927) закранаецца праблема прастытуцыі, якая выяўляецца як «хвароба росту», што будзе пераадолена дзякуючы хуткаму развіццю грамадства.

У элегічным, імпрэсіяністычным апавяданні «Пробуюць грушы шумець» Я-герой міжволі назірае за дзяўчынай, «здалёк падобнай на ляльку» [6, 403], якая ўвечары выфранціўшыся «ходзіць гуляць на шырокія вуліцы» [6, 404], а ўдзень сустракаецца з суседам-студэнтам. «Там гэта продаж, а тут шчырасць і чыстата. І можа тым не паганіцца гэтае», – разважае Я-герой над яе паводзінамі [6, 405]. Адначасна ён уважліва апісвае стан прыроды: ранняя вясна, хмурны дзень, лужыны, «голыя яшчэ і абсохшыя грушы перад акном» [6, 405]. Галіны груш «пахнуць веснавымі пупішкамі і сінімі-сінімі першымі кветкамі» [6, 402], Я-герой марыць пра час, калі на грушах будзе шумець лісце і няўтульнасць, неўладкаванасць ранніх вясновых дзён, якія прадказваюць блізкі росквіт прыроды, будзе пераадолена. Адначасна ён спадзяецца, што дзяўчына знойдзе сабе «новую чыстату» і будзе «хоць у думках насіць яе, каб не быў адзін толькі продаж»[6, 406]. Сучаснасць падаецца аўтару складаным часам, калі новае жыццё яшчэ не набрала сілу – як першыя кветкі, што пачынаюць цвісці сярод лужын і бруду вялікіх вуліц.

У гэтым апавяданні – як і ў многіх іншых, дзе выяўляюцца праблемы асабістых стасункаў, –мае месца празмерная цікавасць да «жаночых таямніц», схільнасць да падглядання (вуаерызм). Пры звароце да тэмы сексуальнай рэвалюцыі аўтары, здаралася, імкнуліся не столькі выявіць сацыяльныя праблемы, колькі зацікавіць чытачоў любоўнай інтрыгай (больш падрабязна гл. [7]).

У «Сценах» дзяўчына лёгкіх паводзін паўстае здольнай да змены свайго ладу жыцця. Наборшчык Люцыян Марцінюк – «новы чалавек», які адчувае сябе далучаным да ўрачыстага змагання за



Рэпазіторый ВДУ

будучыню, – завозіць у бальніцу хворую жанчыну, што ходзіць на нядобрую начную працу. Праз нейкі час ён бачыць яе на дэманстрацыі ў шэрагах работніц. Сустрэча моцна ўражвае Марцінюка, бо жанчына прыкметна змянілася: калі раней ейны твар быў «страшны ад расцёртых парфум» [6, 461], то цяпер ён асветлены ціхай радасцю, а «шырокія вочы глядзяць чыстаю глыбінёю» [6, 472]. Радасны настрой героя зліваецца з агульным святочным уздымам і ўмацоўвае думку пра тое, што грамадскія змены нясуць ратаванне для жанчын [6, 459].

Апавяданне «Справа Віктара Лукашэвіча», напісанае ў 1929 годзе, калі кіраўніцтваСССР узяло курс на згортванне сексуальнай рэвалюцыі –адно з найбольш вядомых у спадчыне К. Чорнага.У цэнтры твора – трагедыя маладой жанчыны Маргарыты, былой жонкі савецкага начальніка Марынковіча. Марынковіч лічыць сябе «новым чалавекам», які «павінны адкінуць ад сябе старыя мяшчанскія традыцыі» [6, 71], «павінен быць вольным, прыгожым, не звязаным нічым, у яго павінна быць мінімум няволі і максімум волі» [6, 71]. Ёнпакідае Маргарыту і маленькага сына, прычым жанчына моцна хворая праз аборты, якія рабіла штогод. Марынковіч часта змяняе жонак, ён паўстае беспрынцыповым чалавекам, які не мае ўласных поглядаў, дбае толькі пра сваю пасаду і жыццёвыя выгоды, не падтрымлівае карысныя справы. Маргарыта – чулая, зычлівая, працавітая – памірае неўзабаве пасля вяртання ў родную вёску.

Аналіз твораў дазваляе вылучыць наступныя тэндэнцыі:

- Унутраны светжанчыны – ахвяры сексуальнай рэвалюцыі – звычайна застаецца нераскрытым: аўтар знаёміць чытача з пэўнай жыццёвай гісторыяй, найбольшую увагу надае драматычным эпізодам, тым часам як асэнсаванне наступстваў памылковага выбару, перажыванне здрады ці непажаданай цяжарнасці застаецца «за кадрам». Пісьменнікі-мужчыны рэдка наважваліся пісаць пра спецыфічна жаночы досвед, звяртацца да выяўлення ўнутранага жыцця гераінь.
- Мужчына-спакуснік у прозе 1920-х гг. заўсёды паўстае ўвасабленнем «варожай» сацыяльнай групы – гэта нэпман, несумленны камуніст, былы афіцэр або дваранін, яго лёс заўсёды незайздросны, стаўленне да жыцця шаблоннае і прымітыўнае.Нюансы міжасабовых дачыненняў не вельмі цікавілі тагачасных аўтараў, важна было канстатаваць сацыяльную праблему, а не заглыбляцца ў псіхалогію.
- Гісторыя «спакушэння дзяўчыны» – увасабленне стэрэатыпных уяўленняў пра тое, што жанчына ў меншай ступені чым мужчына нясе адказнасць за развіццё адносін і іх наступствы. Мужчына абвінавачваецца як ініцыятар сексуальных стасункаў, а дзяўчына – наіўная, даверлівая, недасведчаная, – паўстае яго бязвіннай ахвярай.
- Жаночыя праблемы часта гіпербалізуюцца – свабодныя стасункі для гераінь, як правіла, маюць кепскі фінал: няўдалы аборт / хвароба / смерць дзіцяці / самагубства. У гэтым можна бачыць як водгулле установак традыцыйнай культуры (свабодныя паводзіны жанчыны маюць быць пакараны), так і культурны шок ад наступстваўсексуальнай рэвалюцыі, бо рэаліі гарадскога жыцця 1920-х гг. рэзка разыходзіліся з нормамі традыцыйнай вясковай маралі, на якой выхоўваліся будучыя беларускія творцы. Пэўны дыдактызму выяўленні«небяспечнага» шляху вызначаўся спачуваннем недасведчаным дзяўчатам, імкненнем іх перасцерагчы.

Творы 1920-х гг., прысвечаныя праблемам міжасабовых адносін, пераважна маюць тыповы сюжэт, унутраны свет персанажаў не з'яўляецца прадметам паглыбленай распрацоўкі. Пры гэтым у творах выяўляюццарэаліі эпохі, акцэнтуюцца праблемныя моманты. Аўтарыдэманструюць, што ідэі свабодных стасункаў часта выкарыстоўваюцца мужчынамі, каб схіліць дзяўчыну да інтымнай блізкасці, прычым сексуальная разняволенасць ацэньваецца адмоўна і мае сумныя вынікі. Адчуванне віны за няправільныя паводзіны для маладых жанчын нашмат мацнейшаеза веру ў новыя ідэі, што неаднойчы адлюстроўваецца ў тагачаснай прозе.

**Літаратура**


1. Турышева О. Н. Теория и методология зарубежного литературоведения: учеб. пособие / О. Н. Турышева. – М. Флинта: Наука, 2012. – 160 с.
2. Женщины на краю Европы / Под ред. Е. Гаповой. – Мн. : ЕГУ, 2003. – 436 с.
3. Галавач, П. Р. "Дробязі" жыцця / П. Р. Галавач. – Менск : Белдзяржвыдавецтва, 1927. – 176 с.
4. Бядуля, З. Збор твораў: у 5 т. / З. Бядуля. – Мн.: Маст. літ., 1989. – Т. 4: Язэп Крушынскі: Раман. Кн. 1. – 1987. – 375 с.
5. Колас, Я. Збор твораў : у 20 т. / Я. Колас – Мн.: Беларуская навука, 2009. – Т. 6. Апавяданні (1925 – 1951), раннія празаічныя творы (1900 – 1906), пераклады (1907) –2009. –574 с.; Т. 12. Аповесці – 2010. – 518 с.
6. Чорны, К. Збор твораў : у 8 т. / К. Чорны. – Мн.: Мастацкая літаратура. – Т. 1: Апавяданні. 1923 – 1927 гг.. –1972. –554 с.; Т. 2: Апавяданні. 1928 – 1944 гг.. –1972. – 488 с.
7. Чарнавокая, А. М. Атрактыўная функцыя жаночых вобразаў у мастацкай прозе / А. М. Чарнавокая // Журнал Белорусского государственного университета. Филология – 2018. – №2. – С. 33 – 44.


Рэпазіторый ВДУ

**A.M. Tscharnavokaya**
The Yanka Kupala Institute of Literature Studiesthe Center for Belarusian Culture, Languageand Literature Research of the National Academy of Sciences of Belarus
e-mail: lecsa87@gmail.com

**The reflection of sexual revolution consequences in Belarusian prose of 1920th**

*Key words: sexual revolution, social problems, Yakub Kolas, Kusma Tschorny, Platon Galavatsch.*

*After the revolution of 1917 norms of the interpersonal relations began to change dramatically. Belarusian prose has reflected the clash of "new views" and traditional morals, which had tragic consequences for many young women. The works devoted to this topic, are analysed in this article.*

**Е.В. Чеснокова**
Институт литературоведения НАН Беларуси
e-mail: catisnot@gmail.com

УДК 821.131.1“18”

## ИТАЛЬЯНСКОЕ «СЕРДЦЕ» НА «НОВОЙ» БЕЛОРУССКОЙ ЗЕМЛЕ

*Ключевые слова: итальянская литература, роман воспитания, нравственно-психологическое становление, патриотизм, общечеловеческие ценности.*

*В статье на примере повести «Сердце» итальянского писателя второй половины XIX века Эдмондо де Амичиса анализируются характерные особенности такого литературного жанра, как роман воспитания, а также его место, роль и функции в становлении и формировании личности. Отмечается значимость данного произведения в воспитании молодого поколения с целью привить общечеловеческие морально-этические и нравственные ценности.*

Влияние искусства слова на человека трудно переоценить. Литература не только воспитывает, транслирует нравственно-эстетические установки, дает представление о том, что прекрасно или безобразно, плохо или хорошо, но и погружает читателя в те или иные сложные жизненные ситуации и предлагает пути выхода из них. Как следствие, литература выполняет следующие функции: гносеологическую (познавательную), эстетическую, гедонистическую, воспитательную и аксиологическую (оценочную). Последние две тесно связаны между собой. Когда автор художественного текста описывает жизненные ситуации, переживания, поведение и мысли героев, он оценивает их, сознательно или нет, высказывает свое мнение: «…в произведении складывается целая система художественных утверждений и отрицаний, оценок. …Каждое произведение несет в себе и стремится утвердить в сознании воспринимающего некоторую систему ценностей, определенный тип эмоционально-ценностной ориентации» [6]. Важно, что все вышеуказанные функции в полной мере реализуются не в виде сухих выводов после прочтения литературного произведения, а непосредственно в процессе взаимодействия читателя и текста. В зависимости от целей, которые преследует автор того или иного художественного текста, более очевидным становится влияние на читателя одной или нескольких функций. Например, особый тип литературного произведения, роман воспитания, который описывает психологическое, нравственное и социальное становление личности главного героя и направлен на формирование у духовно незрелого реципиента определенной системы ценностей, нравственных установок, возможно даже элементарных поведенческих моделей [2]. Некоторые авторы романов воспитания излагают историю в сказочно-фантастической манере. Одним из первых примеров подобных произведений является сочинение древнеримского писателя Апулея под названием «Золотой осел» (II в.н.э.). Сам жанр роман воспитания получил широкое распространение в Германии в эпоху Просвещения (И.В. фон Гёте «Годы учения Вильгельма Мейстера», 1796 и др.). Более поздние классические образцы воспитательного романа (романа воспитания): Ч. Диккенс («Дэвид Копперфильд», 1849), Г. Флобер («Воспитание чувств», 1869), И.А. Гончаров («Обыкновенная история», 1847), Ф.М. Достоевский («Неточка Незванова», 1849; «Подросток», 1875) [2]. В период после Второй мировой войны роман воспитания снова обрел популярность благодаря произведениям Д.Д. Сэлинджера и Г. Грасса («Над пропастью во ржи», 1951 и «Жестяной барабан», 1959 соответственно). Наиболее ярким примером романа воспитания в современной литературе является роман «Гарри Поттер» английской писательницы Джоан Роулинг. В белорусской современной литературе известны такие произведения, как «Авантюры студиозуса Вырвича» Л. Рублевской, «Проклятие» А. Гапеева и «Двенадцать подвигов Геракла» П. Васюченко [5].



Репозиторий ВГУ